**МІНІСТРЭСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
Установа адукацыі
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт»
С.П.Рубнікoвіч
27.06.2023
Рег. № ВД- СТ.037/2324 /вуч.

Контрольный экземпляр

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
**Вучэбная праграма ўстановы адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**

**7-07-0911-01 «Лячэбная справа»;**
**7-07-0911-02 «Медыка-прафілактычная справа»;**
**7-07-0911-03 «Стаматалогія»;**
**7-07-0911-06 «Педыятрыя»;**
**7-07-0912-01 «Фармацыя»**

2023

Вучэбная праграма складзена на падставе тыпавой праграмы для ўстаноў вышэйшай адукацыі, зацверджаннай 29.04.2022, рэгістрацыйны № ТД-СГ.037/тып; вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-01 "Лячэбная справа", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-01/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-02 "Медыка-прафілактычная справа", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-02/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-03 "Стаматалогія", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-03/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-06 "Педыятрыя", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-06/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0912-01 "Фармацыя", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0912-01/2324

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Н.А.Поляк, дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай філасофіі і паліталогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
(пратакол № 14 ад 25.05.2023);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
(пратакол № 6 ад 27.06.2023)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» – вучэбная дысцыпліна, якая характарызуецца міждысцыплінарнасцю з акцэнтам на канцэптуальныя веды па гісторыі развіцця дзяржаўных інстытутаў. Вучэбная дысцыпліна адлюстроўвае сістэмны падыход да гісторыі фарміравання і развіцця разнастайных этапаў беларускай дзяржаўнасці, дэманструе іх эвалюцыю з улікам унутраных фактараў і глабальных працэсаў, фарміруе практыка-арыентаваныя ўменні.

Мэта вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» - фарміраванне абгрунтаванай патрыятычнай пазіцыі.

Задачы вучэбнай дысцыпліны заключаюцца ў фарміраванні сістэмы ведаў пра гісторыю беларускай дзяржаўнасці; у стварэнні ўстойлівага ўяўлення пра гістарычны шлях і мэты далейшага развіцця беларускай дзяржавы; уменняў і навыкаў, неабходных для асэнсавання падзей і з'яў рэчаіснасці ў цеснай сувязі мінулага, сучаснага і будучага; аргументаванага і дакладнага фармулявання ўласнай пазіцыі па актуальных пытаннях палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сферах.

Веды, уменні і навыкі, атрыманыя пры вывучэнні дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» неабходны для паспяховага вывучэння наступных вучэбных дысцыплін і модуляў «Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны», «Паліталогія».

Студэнт, які засвоіў змест вучэбнага матэрыялу вучэбнай дысцыпліны, павінен валодаць наступнай універсальнай кампетэнцыяй:

УК- Валодаць здольнасцю аналізаваць працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды, выяўляць фактары і механізмы гістарычных змен, вызначаць сацыяльна-палітычнае значэнне гістарычных падзей (асоб, артэфактаў і сімвалаў) для сучаснай беларускай дзяржаўнасці, дасканала выкарыстоўваць выяўленыя заканамернасці ў працэсе фарміравання грамадзянскай ідэнтычнасці.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» студэнт павінен

**ведаць:**

метадалагічныя асновы і перыядызацыю гісторыі беларускай дзяржаўнасці;

ключавыя катэгорыі, звязаныя з гісторыяй і дзяржаўным будаўніцтвам Рэспублікі Беларусь;

характарыстыкі канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;

этапы фарміравання беларускай нацыі;

гісторыка-рэтраспектыўныя і сучасныя характарыстыкі культурна-цывілізацыйнага развіцця Беларусі;

**умець:**

фармуляваць і аргументаваць асноўныя ідэі і каштоўнасці беларускай мадэлі развіцця;

прымяняць атрыманыя веды ў практычнай, вучэбнай і прафесійнай

сферах;

характырызаваць атрыбутыўныя рысы беларускай нацыі;

аналізаваць асноўныя факты і падзеі ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці і ацэньваць іх.

**валодаць:**

базавымі навукова-тэарытычнымі ведамі для рашэння тэарытычных і практычных задач;

сістэмным і параўнаўчым аналізам;

даследчыцкімі навыкамі;

міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

У рамках адукацыйнага працэсу па дадзенай дысцыпліне студэнт павінен акрамя тэарытычных ведаў, атрымаць практычныныя ўменні і навыкі па спецыяльнасці. Развіць свой каштоўнасна-асабісты і духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які будзе гатовы да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» адводзіцца 108 гадзін. Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 26/4[1] гадзін лекцый (у тым ліку 9 гадзін кіруемай самастойнай працы (КСП)), 28/8[1] гадзін семінараў, 54/96[1] гадзіны самастойнай працы студэнтаў.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з навучальным планам па спецыяльнасці ў форме экзамену (1[2] семестр и 2[3] семестр).

Форма атрымання адукацыі – вочная дзённая/завочная.

---

[1]Для спецыяльнасці 7-07-0912-01 "Фармацыя" (завочная форма атрыманя адукацыі)

[2] Для спецыяльнасцей 7-07-0911-01 "Лячэбная справа", 7-07-0912-01 "Фармацыя", 7-07- 0911-03 "Стаматалогія"

[3] Для спецыяльнасцей 7-07- 0911-06 "Педыятрыя", 7-07-0911-02 "Медыка-прафілактычная справа"

# РАЗМЕРКАВАННЕ БЮДЖЭТУ ВУЧЭБНАГА ЧАСУ ПА СЕМЕСТРАХ

| Код, назва спецыяльнасці | Семестр | Колькасць гадзін вучэбных заняткаў | | | | | | Форма атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | аўдыторных | з іх | | | Самастойных пазааўдыторных | |
| | | | | лекцый | КСП | семінараў | | |
| 7-07-0911-01 «Лячэбная справа» | 1 | 108 | 54 | 26 | 9 | 28 | 54 | Экзамен |
| 7-07-0911-06 «Педыятрыя» | 1 | 108 | 54 | 26 | 9 | 28 | 54 | Экзамен |
| 7-07-0911-02 «Медыка-прафілактычная справа» | 2 | 108 | 54 | 26 | 9 | 28 | 54 | Экзамен |
| 7-07-0911-03 «Стаматалогія» | 2 | 108 | 54 | 26 | 9 | 28 | 54 | Экзамен |
| 7-07- 0912-01 «Фармацыя» (вочная форма навучання | 1 | 108 | 54 | 26 | 9 | 28 | 54 | Экзамен |
| 7-07- 0912-01 «Фармацыя» (завочная форма навучання) | 1 | 108 | 12 | 4 | | 8 | 96 | Экзамен |

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАЎ
## (ВОЧНАЯ ДЗЁННАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

| Назва раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | Лекцыі | Семінары |
| **1. Асноўныя этапы развіцця беларускай дзяржаўнасці** | **16** | **16** |
| 1.1. Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну | 1 | |
| 1.2. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі | 1 | 2 |
| 1.3.Вялікае княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы | 4 | 2 |
| 1.4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі | 2 | 2 |
| 1.5. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917-1941 гг. | 2 | 2 |
| 1.6. Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея навейшай гісторыі | 2 | 4 |
| 1.7. Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР | 2 | 2 |
| 1.8. Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь | 2 | 2 |
| **2. Асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь** | 6 | 6 |
| 2.1.Канстытуцыя як Асноўны Закон дзяржавы | 1 | 1 |
| 2.2. Заканадаўчая і судовая галіны ўлады | 1 | 1 |
| 2.3. Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады | 1 | 1 |
| 2.4. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь | 1 | 1 |
| 2.5. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні | 2 | |
| 2.6. Рэгіёны Беларусі | | 2 |
| **3. Беларусь на скрыжаванні культур і цывілізацый** | **4** | **6** |
| 3.1. Этнагенез беларусаў і паходжанне назвы «Беларусь» | 2 | 1 |
| 3.2. Народы і рэлігіі Беларусі | | 1 |
| 3.3. Сацыяльна-эканамічная мадэль сучаснай Беларусі | 1 | 1 |
| 3.4. Беларусь у геапалітычнай прасторы | 1 | 1 |
| 3.5. Дзяржаўныя сімвалы Беларусі | | 2 |
| **Усяго:** | 26 | **28** |

# Тэматычны план вучэбных заняткаў

# (завочная форма навучання)

| Назва раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа |
|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Семінары | |
| **1. Асноўныя этапы развіцця беларускай дзяржаўнасці** | **2** | **4** | **48** |
| 1.1. Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну | | | 4 |
| 1.2. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі | | 1 | 3 |
| 1.3. Вялікае княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы | | 1 | 7 |
| 1.4.Беларусь у складзе Расійскай імперыі | | | 7 |
| 1.5.Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917-1941 гг. | | | 5 |
| 1.6. Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея навейшай гісторыі | 2 | | 7 |
| 1.7. Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР | | 1 | 5 |
| 1.8. Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь | | 1 | 10 |
| **2. Асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь** | **2** | **2** | **24** |
| 2.1.Канстытуцыя як асноўны закон дзяржавы | 1 | | 3 |
| 2.2. Заканадаўчая і судовая галіны ўлады | 1 | | 5 |
| 2.3. Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады | | 1 | 3 |
| 2.4. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь | | 1 | 5 |
| 2.5. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні | | | 4 |
| 2.6. Рэгіёны Беларусі | | | 4 |
| **3. Беларусь на скрыжаванні культур і цывілізацый** | | 2 | **24** |
| 3.1. Этнагенез беларусаў і паходжанне назвы «Беларусь» | | 1 | 7 |
| 3.2. Народы і рэлігіі Беларусі | | 1 | 5 |
| 3.3. Сацыяльна-эканамічная мадэль сучаснай Беларусі | | | 5 |
| 3.4. Беларусь у геапалітычнай прасторы | | | 4 |
| 3.5 Дзяржаўныя сімвалы Беларусі | | | 3 |
| **Усяго:** | **4** | **8** | **96** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## 1. Асноўныя этапы развіцця беларускай дзяржаўнасці

### 1.1. Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну

Дзяржава як асноўны палітычны інстытут. Паняцце дзяржаўнасці. Незалежнасць і суверэнітэт. Нацыя і дзяржава. Этапы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Крыніцы па гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

### 1.2. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі

Раннефеадальныя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях. Старажытная Русь. Агульныя рысы і асаблівасці развіцця Полацкага і Тураўскага княстваў. Хрышчэнне Русі як фактар цывілізацыйнага выбару. Феадальная раздробленасць. Месца ўсходнеславянскіх зямель у сістэме сярэднявечных міжнародных адносін.

### 1.3. Вялікае княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы

Прычыны і асноўныя канцэпцыі ўзнікнення ВКЛ. Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ. Аб'яднанне беларускіх зямель у складзе ВКЛ. Барацьба за аб'яднанне Русі. Адносіны з Ордэнам і Залатой Ардой. Роля беларускіх зямель у ВКЛ. Крэўская унія і вэстэрнізацыя сацыяльна-палітычных інстытутаў. Магдэбургскае права.

Прававое і палітычнае значэнне Люблінскай уніі. Становішча беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай. Паланізацыя як фактар палітычнага, культурнага і грамадскага жыцця. «Шляхецкая дэмакратыя» і яе ўплыў на развіццё дзяржавы. Адносіны з суседзямі і паслабленне Рэчы Паспалітай.

### 1.4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі

Падзелы Рэчы Паспалітай. Русіфікацыя і дэпаланізацыя. Пытанне дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі першай паловы XIX ст. Паўстанні 1830-1831 і 1863-1864 гг. на тэрыторыі Беларусі. Эканамічнае развіццё беларускіх зямель. Заходнерусізм і краёвасць. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі. Часопіс «Гоман» і дзейнасць беларускіх народнікаў. Рэвалюцыйныя падзеі 1905 – 1907 гг. у Беларусі. «Наша ніва» і беларуская нацыянальная ідэя ў пачатку XX ст.

### 1.5. Нацыянальна дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917 – 1941 гг.

Першая сусветная вайна на беларускіх землях. Актывізацыя нацыянальнага руху ў гады Першай сусветнай вайны. Рэвалюцыі 1917 г. і беларускае пытанне. Усебеларускі з'езд 1917 г. Абвяшчэнне БНР. Белнацкам і яго роля ў стварэнні ССРБ. ЛітБелССР. Польска-савецкая вайна і другое абвяшчэнне ССРБ. Падпісанне Рыжскай мірнай дамовы і яе наступствы для беларускай дзяржаўнасці. Фарміраванне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР). Рэалізацыя нацыянальна-дзяржаўнай мадэлі развіцця. Стварэнне індустрыяльна-аграрнай рэспублікі. Фарміраванне межаў і адміністратыўна-тэрытарыяльны лад БССР у 1919 – 1939 гг. Супярэчнасці развіцця сацыяльна-культурнай сферы ў 1930-я гг. у БССР. Дасягненні і трагедыі савецкай эпохі.

### 1.6. Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея навейшай гісторыі

Прычыны Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з

БССР. Нападзенне нацысцкай Германіі на СССР. Акупацыйны рэжым у Беларусі. Нямецка-фашысцкі генацыд і дэмаграфічныя страты Беларусі ў вайне. Халакост. Маштаб і значэнне партызанскага і падпольнага руху ў Беларусі. Удзел беларусаў у ключавых бітвах Вялікай Айчыннай вайны. Вызваленне Беларусі. Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя «Баграціён». Уклад беларускага народу ў Перамогу. Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларусаў.

**1.7. Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР**

БССР – краіна-заснавальніца ААН. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг. Нарастанне застойных з'яў у 1970-я – першай палове 1980-х гг. Грамадска-палітычныя працэсы ў БССР на мяжы 80-90 –х гг. XX ст.

**1.8. Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь**

Распад СССР і яго прычыны. Палітычны і гаспадарчы крызіс першых гадоў незалежнасці. Прыняцце Канстытуцыі і першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Рэферэндумы 1995, 1996, 2004 гадоў і іх уплыў на стабілізацыю сітуацыі ў краіне. Асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця ў пачатку XXI ст. Сучасныя дасягненні беларускай дзяржавы.

**2. Асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь**

**2.1. Канстытуцыя як асноўны закон дзяржавы**

Фарміраванне прававых традыцый у Беларусі. «Руская праўда» і Статуты ВКЛ. Савецкія канстытуцыі 1919, 1927, 1937, 1978 гадоў. Значэнне Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце 27 ліпеня 1990 г. Прызнанне прынцыпаў Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Канстытуцыя 15 сакавіка 1994 г. і характар унесеных у яе змяненняў. Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі як вышэйшая каштоўнасць і мэта грамадства і дзяржавы, абвешчаныя Канстытуцыяй. Іерархія нарматыўна-прававых актаў.

**2.2. Заканадаўчая і судовая галіны ўлады**

Перадпарламенцкія формы прадстаўніцтва: веча і сеймы. Беларускія дэпутаты ў Дзяржаўных думах Расійскай імперыі. Савецкая форма народнага прадстаўніцтва: ЦВК і Вярхоўны Савет. Нацыянальны сход – двухпалатны парламент у суверэннай Беларусі. Структура і функцыі Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў.

Гістарычныя формы судовых органаў у айчыннай гісторыі. Віды і паўнамоцтвы сучасных судоў у Рэспубліцы Беларусь. Вярхоўны і Канстытуцыйны суды. Парадак падбора і прызначэння суддзяў.

**2.3. Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады**

Гістарычныя формы выканаўчай улады Беларусі. Чыны княскай адміністрацыі Старажытнай Русі. Асноўныя службовыя асобы цэнтральнага апарату ў ВКЛ. З'яўленне міністэрскай формы арганізацыі выканаўчай улады. Беларусы на вышэйшых дзяржаўных пасадах у Расійскай імперыі. Савет Народных Камісараў і далейшае развіццё выканаўчай улады ў савецкі час. Функцыі і задачы сучаснага ўрада. Структура Урада Рэспублікі Беларусь. Прэм'ер-міністр.

**2.4. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**

Развіццё інстытута кіраўніка дзяржавы ў айчыннай гісторыі. Асаблівасці манархічнай формы кіравання ў гістарычнай рэтраспектыве. Спецыфіка арганізацыі вышэйшага кіраўніцтва краіны ў савецкі час. Прэзідэнская рэспубліка – выбар беларускага народа. Парадак выбараў Прэзідэнта. Функцыі і паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы як гаранта выканання Канстытуцыі, правоў і свабод грамадзян. Прэзідэнт – Галоўнакамандуючы Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

**2.5. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні**

Гістарычная рэтраспектыва развіцця палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у Беларусі. Пераход ад аднапартыйнай сістэмы да шматпартыйнасці. Нарматыўна-прававая база дзейнасці партый і грамадскіх аб'яднанняў. Тыпалагізацыя палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў.

**2.6. Рэгіёны Беларусі**

Гістарычныя формы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу на беларускіх землях: удзельныя княствы, ваяводствы і паветы, губерні, уезды, воласці, раёны, акругі, вобласці. Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь. Функцыі і паўнамоцтвы мясцовага кіравання і самакіравання.

**3. Беларусь на сумежжы культур і цывілізацый**

**3.1. Этнагенез беларусаў і паходжанне назвы «Беларусь»**

Асноўныя гіпотэзы аб паходжанні беларусаў. Этапы фарміравання беларускай нацыі. Фактары, якія паўплывалі на генезіс і далейшае развіццё. Беларусы ў свеце, дыяспара.

Белая Русь – «Белоруссия» – Беларусь. Варыянты паходжання назвы. Моўная палітыка. Білінгвізм – характэрная рыса сучаснай беларускай нацыі. Гістарычныя прыклады двухмоўя.

**3.2. Народы і рэлігіі Беларусі**

Гісторыя фарміравання асноўных этнічных груп у Беларусі. Этнічны склад сучаснай Беларусі. Кароткая гісторыя канфесій у Беларусі. Канфесійны склад насельніцтва. Прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў канфесійнай сферы.

**3.3. Сацыяльна-эканамічная мадэль сучаснай Беларусі**

Перадумовы фарміравання беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Асноўныя фактары сучаснага эканамічнага развіцця Беларусі. Дзяржава для народа – галоўны прынцып айчыннай сацыяльна-эканамічнай мадэлі. Усебеларускі народны сход. Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця айчыннай эканомікі.

**3.4. Беларусь у геапалітычнай прасторы**

Геапалітычны фактар фарміравання беларускай дзяржаўнасці. Характарыстыка сучаснага геапалітычнага становішча Беларусі. Шматвектарнасць знешняй палітыкі. Расія і Кітай – стратэгічныя партнёры Беларусі. Бліжняя і далёкая дугі міжнародных адносін. Беларусь у інтэграцыйных садружнасцях. Саюзная дзяржава Расіі і Беларусі.

**3.5. Дзяржаўныя сімвалы Беларусі**

Значэнне Гімна, Герба і Сцяга для дзяржаўнасці. Гістарычная сімволіка на беларускіх землях. Варыятыўнасць сімволікі ў іншых краінах. Гісторыя і

сімвалічнае значэнне Дзяржаўнага Сцяга. Дзяржаўны Герб і яго сэнсавая трактоўка. Дзяржаўны Гімн – музычнае адлюстраванне дзяржаўнай традыцыі. Дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь і іх значэнне.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ»

## (ВОЧНАЯ ДЗЁННАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

| Нумар раздзелу, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная праца | Формы кантролюведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцый | КСП | семінараў | | |
| **1.** | **Асноўныя этапы развіцця беларускай дзяржаўнасці** | **16** | **5** | **16** | **26** | |
| 1.1.<br>1.2. | **Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі**<br>1.Дзяржаўнасць як аб'ект даследавання.<br>2.Этапы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці і асноўныя крыніцы па яе вывучэнні.<br>3.Полацкае і Тураўскае княства – першыя дзяржаўныя ўтварэнні на Беларусі.<br>4.Усходнеславянскія землі ў сістэме сярэдневяковых міжнародных адносін. | 2 | 1 | | 2 | |
| 1.2 | **Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі**<br>1.Агульныя рысы і асаблівасці палітычнага развіцця Полацкага і Тураўскага княстваў.<br>2.Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX-XIII стст.<br>3.Хрысціянізацыя беларускіх зямель. | | | 2 | 2 | Кантрольныя апытванне, электронны тэст |
| 1.3 | **Вялікае княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы**<br>1.Прычыны і асноўныя канцэпцыі ўтварэння ВКЛ.<br>2.Унутры- і знешнепалітычнае становішча беларускіх зямель у складзе ВКЛ. | 2 | 0,5 | | 1 | |
| | **Становішча беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай**<br>1. Люблінская ўнія. Палітычны, прававы, сацыяльны статус беларускіх зямель у федэратыўнай дзяржаве.<br>2. Адносіны з суседзямі і паслабленне Рэчы Паспалітай. | 2 | 0,5 | | 1 | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3 | **Вялікае княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы**<br>1.Роля беларускіх зямель у працэсе будаўніцтва і дзяржаўнага развіцця ВКЛ.<br>2.Дзяржаўна-прававое становішча ВКЛ пасля Люблінскай уніі.<br>3.Войны XVII–XVIII стст. і іх наступствы для беларускіх зямель.<br>4. Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. | | | 2 | 1 | Даклады і паведамленні на семінарскіх занятках,рэфераты |
| 1.4 | **Беларусь у складзе Расійскай імперыі**<br>1. Падзелы Рэчы Паспалітай. Палітыка расійскага ўрада ў к. XVIII – пач. XIX стст.<br>2. Пытанне дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі пач. XIX ст.<br>3. Эканамічнае развіццё беларускіх зямель у сяр. XIX ст.<br>4. Заходнерусізм і краёвасць. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі і дзейнасць народнікаў. | 2 | 0,5 | | 1 | |
| 1.4 | **Беларусь у складзе Расійскай імперыі**<br>1. Палітыка расійскага ўрада ў к. XVIII – пач. XIX стст. на далучаных землях Беларусі.<br>2. Грамадска-палітычны рух – паўстанні 1830–1831 і 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі.<br>3. Рэвалюцыя 1905-1907 гг. «Наша ніва» і беларуская нацыянальная ідэя пачатку XX ст. | | | 2 | 1 | Суразмова па пытаннях семінара |
| 1.5 | **Нацыянальна дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917 – 1941 гг.**<br>1. Першая сусветная вайна і актывізацыя нацыянальнага руху на беларускіх землях.<br>2. Рэвалюцыі 1917 г. Першы Усебеларускі з'езд 1917 г. Абвяшчэнне БНР.<br>3. Стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці (снежань 1918– сакавік 1921 г.). Польска-савецкая вайна. | 2 | 0,5 | | 2 | |
| 1.5 | **Нацыянальна дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917 – 1941 гг.**<br>1. Умовы фарміравання СССР.<br>2. Нацыянальна-дзяржаўная мадэль БССР. Стварэнне індустрыяльна-аграрнай рэспублікі.<br>3. Супярэчнасці развіцця сацыяльна-культурнай сферы ў 1930-я гг. у БССР. | | | 2 | 2 | Размова па дадатковых пытаннях,даклады і паведамленні на канферэнцыях |
| 1.6 | **Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея навейшай гісторыі**<br>1. Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Савецкай і Заходняй Беларусі.<br>2.Напад нацысцкай Германіі на СССР. | 2 | 0,5 | | 1 | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3.Партызанскі і падпольны руху ў Беларусі.<br>4. Аперацыя Баграціён. Заканчэнне вайны | | | | | |
| 1.6 | **Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея навейшай гісторыі**<br>1. Тэрытарыяльны падзел Беларусі і ўсталяванне акупацыйнага апарата кіравання.<br>2. Палітыка акупацыйных улад у Беларусі ў галіне эканомікі, адукацыі, культуры.<br>3. Палітыка генацыда на тэрыторыі Беларусі.<br>4. Беларускі калабарацыянізм. | | | 2 | | Прэзентацыі |
| 1.6 | **Медыцына ў гады вайны**<br>1. Арганізацыя медыцынскай дапамогі на франтах.<br>2. Асаблівасці аказання медыцынскай дапамогі ў партызанскіх атрадах.<br>3. Дзейнасць медыкаў у падполлі.<br>4. Дзяцінства ва ўмовах вайны. | | | 2 | 2 | Публікацыі артыкулаў |
| 1.7 | **Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР**<br>1. Аднаўленне эканомікі пасля вайны.<br>2. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1950-х – у 1970-я гг.<br>3. БССР на мяжы 80-90–х гг. XX ст. | 2 | 0,5 | | 2 | |
| 1.7 | **Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР**<br>1. БССР – краіна-заснавальніца ААН.<br>2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў канцы 40-х – пачатку 80-х гг.<br>3. Палітыка перабудовы. | | | 2 | 2 | Суразмова па пытаннях семінара, рэфераты |
| 1.8 | **Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь**<br>1. Распад СССР і яго прычыны. Абвяшчэнне суверэнітэту Беларусі.<br>2. Крызіс першых гадоў незалежнасці Рэспублікі Беларусь (кан 90-х гг.)<br>3. Асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця ў пачатку XXI ст. | 2 | 1 | | 2 | Даклады і паведамленні на семінарскіх занятках |
| 1.8 | **Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь. Выніковыя заняткі па раздзелу**<br>1. . Змены сістэмы ўлады. Прыняцце Канстытуцыі і папраўкі да яе.<br>2. Трансфармацыя эканамічнай сістэмы Беларусі: крызіс і стабілізацыя (кан. XX-пач XXI стст). | | | 2 | 4 | Суразмова па пытаннях семінара, апытванне па датах і паняццях |
| **2** | **Асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь** | **6** | **2** | **4** | **14** | |
| 2.1-2.2 | **Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Заканадаўчая і судовая галіны ўлады**<br>1.Фарміраванне канстытуцыйна-прававых асноў Беларусі. | 2 | 1 | | 2 | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Канстытуцыя 15 сакавіка 1994 г., і характар унесеных у яе змен.<br>3. Формы народнага прадстаўніцтва: вечы, сойм, Дзяржаўная дума, Цэнтральны выканаўчы камітэт, Вярхоўны Савет.<br>4. Гістарычныя формы судовых органаў у айчынным мінулым. | | | | | |
| 2.1-2.2 | **Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Заканадаўчая і судовая галіны ўлады**<br>1. Чалавек, яго правы, свабоды, гарантыі і іх рэалізацыя ў Канстытуцыі Беларусі.<br>2. Нацыянальны сход – двухпалатны парламент сучаснай Беларусі.<br>3. Судовая сістэма ў Рэспубліцы Беларусь. | | | 2 | 2 | Даклады і паведамленні на семінарскіх занятках, электронныя тэсты |
| 2.3-2.4 | **Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады. Прэзідэнт Рэспублікі**<br>1. Гістарычныя формы выканаўчай улады ў Беларусі.<br>2. Асноўныя службовыя пасады і гістарычныя формы чыноўніцкага апарату.<br>3. Развіццё інстытута кіраўніка дзяржавы ў айчыннай гісторыі (X– 90-я гг.XX стст.) | 2 | 0,5 | | 3 | |
| 2.3-2.4 | **Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады. Прэзідэнт Рэспублікі**<br>1. Структура выканаўчай улады. Функцыі і задачы сучаснага урада Беларусі.<br>2.Прэзідэнская рэспубліка – выбар беларускага народа.<br>3. Функцыі і паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы. | | | 2 | 3 | Публікацыі артыкулаў |
| 2.5 | **Палітычныя партыі і грамадскія аб’яднанні**<br>1.Гістарычная рэтраспектыва развіцця палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў у Беларусі.<br>2.Тыпалагізацыя палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь. | 2 | 0,5 | | 2 | |
| 2.6 | **Рэгіёны Беларусі. Вынікавыя заняткі па раздзелу**<br>1.Гістарычныя формы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу на беларускіх землях.<br>2.Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь. | | | 2 | 2 | Суразмова па пытаннях семінара, апытванне па паняццях і тэрмінах |
| **3.** | **Беларусь на сумежжы культур і цывілізацый** | **4** | **2** | **6** | **14** | |
| 3.1 | **Этнагенез беларусаў і паходжанне назвы «Беларусь»**<br>1.Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў. Этапы фарміравання беларускай нацыі.<br>2.Паходжанне назвы «Беларусь».<br>3.Мова як атрыбут дзяржаўнасці. Моўная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь. | 2 | 1 | | 2 | |
| 3.1- | **Народы і рэлігіі Беларусі** | | | 2 | 3 | Суразмова па пытаннях |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.2 | 1.Этнічная і канфесійная гісторыя беларускіх зямель.<br>2.Канфесійная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе. | | | | | семінара |
| 3.3 - 3.4 | **Сацыяльна-эканамічная мадэль краіны. Беларусь у геапалітычнай прасторы**<br>1.Перадумовы фарміравання беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця.<br>2.Галоўны прынцып айчыннай эканамічнай мадэлі і яго рэалізацыя на сучасным этапе.<br>3.Геапалітычны фактар фарміравання беларускай дзяржаўнасці. | 2 | 1 | | 3 | |
| 3.3 - 3.4 | **Сацыяльна-эканамічная мадэль краіны. Беларусь у геапалітычнай прасторы**<br>1. Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця айчыннай эканомікі. Дзейнасць Усебеларускага народнага сходу.<br>2. Характарыстыка сучаснага геапалітычнага становішча Беларусі. | | | 2 | 3 | Электронныя тэсты, публікацыі артыкулаў |
| 3.5 | **Дзяржаўныя сімвалы Беларусі. Выніковыя заняткі па раздзелу**<br>1. Гістарычная сімволіка на беларускіх землях.<br>2. Сучасны Дзяржаўны Герб, Сцяг і іх зместавыя трактоўкі. | | | 2 | 3 | Даклады і паведамленні на канферэнцыях, кантрольныя апытванні,экзамен |
| | **Усяго:** | **26** | **9** | **28** | **54** | |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ»

## (ЗАВОЧНАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

| Нумар раздзелу, тэмы | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Формы кантролюведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | лекцый | семінараў | |
| **1** | **Асноўныя этапы развіцця беларускай дзяржаўнасці** | **2** | **4** | |
| **1.2-1.3** | **Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі. Вялікае княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы**<br>1. Полацкае і Тураўскае княства – першыя дзяржаўныя ўтварэнні на Беларусі.<br>2. Прычыны і асноўныя канцэпцыі ўтварэння ВКЛ.<br>3. Люблінская ўнія. Палітычны, прававы, сацыяльны статус беларускіх зямель у федэратыўнай дзяржаве.<br>4. Адносіны з суседзямі і паслабленне Рэчы Паспалітай. | | 2 | Суразмова па пытаннях семінара |
| **1.6** | **Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея навейшай гісторыі**<br>1. Прычыны Другой сусветнай вайны. Аб'яднанне беларускага народа ў складзе БССР.<br>2. Напад нацысцкай Германіі на СССР. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі.<br>3. Маштаб і значэнне партызанскага і падпольнага руху ў Беларусі. Фашысцкі генацыд.<br>4. Аперацыя Баграціён. Страты Беларусі ў вайне. | 2 | | |
| **1.7 - 1.8** | **Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР. Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стст.**<br>1. Аднаўленне эканомікі пасля вайны.<br>2. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1950-х – у 1970-я гг.Распад СССР.<br>3. Афармленне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Змены ў сістэме ўлады. | | 2 | Размова па дадтковых пытаннях,<br>апытванне па датах і паняццях. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 4. Асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця ў пачатку XXI ст. | | | |
| **2.** | **Асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь** | **2** | **2** | |
| 2.1 – 2.2 | **Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Заканадаўчая і судовая галіны ўлады**<br>1. Фарміраванне канстытуцыйных асноў Рэспублікі Беларусь (X-XX стст).<br>2. Формы народнага прадстаўніцтва: вечы, сойм, Дзяржаўная дума, Цэнтральны выканаўчы камітэт, Вярхоўны Савет.<br>3. Гістарычныя формы судовых органаў у айчынным мінулым. | 2 | | |
| 2.2. | **Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады. Прэзідэнт Рэспублікі.**<br>1. Гістарычныя формы выканаўчай улады ў Рэспубліцы Беларусь.<br>2. Развіццё інстытута кіраўніка дзяржавы ў айчыннай гісторыі (X–XX стст.)<br>3 Асноўныя служдовыя пасады і гістарычныя формы чыноўніцкага апарату. | | 2 | Прэзентацыі, даклады і паведамленні на семінарскіх занятках |
| **3.** | **Беларусь на сумежжы культур і цывілізацый** | | **2** | |
| 3.1- 3.2 | **Этнагенез беларусаў і паходжанне назвы «Беларусь». Народы і рэлігіі Беларусі.**<br>1. Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў. Фаарміраванне беларускай нацыі.<br>2. Паходжанне назвы «Беларусь». Мова як атрыбут дзяржаўнасці.<br>3. Этнічная і канфесійная гісторыя беларускіх зямель. | | 2 | Электронныя тэсты. Экзамен |
| | **УСЯГО** | **4** | **8** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная:**

1. История белорусской государственности : в 5 т. / Национальная академия наук Беларуси, Ин-т истории; [редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) и др.]. – Минск: Бел. навука, 2018–2020. – Т.1-5.
2. Лугвин, С. Б. Политология : учебно-методическое пособие / С. Б. Лугвин. – Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2019. – 162 с.
3. Сироткин А.А. Основы идеологии белорусского государства: учебно-методическое пособие. – Гомель: Гом ГМУ, 2020. – 76 с.

**Дадатковая:**

1. ВКЛ: заканадаўчае забеспячэнне дзяржаўнага суверэнітэту. / В. Ф. Голубеў, В. Л. Лакіза, В. А. Варонін, А. Б. Доўнар, А. А. Скеп'ян (адказны рэдактар) Мінск: Беларуская навука, 2022. – 492 с.
2. Геноцид белорусского народа = Genocide of the Belarusian people: информационно-аналитические материалы и документы / под ред. Шведа А.И. Мн. Беларусь 2022 г – 175 с.
3. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.];– Мінск: Беларускаянавука, 2019. – 573 с
4. История Беларуси. Пособие для подготовки к централизованному тестированию Мінск Аверсэв 2020 – 448 с.
5. История Великой Отечественной войны: очерки совместной истории. Учебное пособие.: Начало Второй мировой войны (Россия и Беларусь: страницы общей истории). Под ред. А. А. Ковалени, Е. И. Пивовара., Мн.: Научный мир, -- 2020. Вып. 1 –144 с.
6. Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.:вучэб.-метад. дапам. / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2017. – 251 с.
7. Лукашев А.А. Атлас по истории белорусской государственности. Мн.: Цымбероў. 2019 – 36 с.
8. Поляк Н.А. Рэлігія на землях Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён / дапаможнік. Мн. ВАРБ. 2017 – 66 с.
9. Попов Б. Белорусы - кто они? Мн.: Деловая печать – 2020 - 88 с.
10. Сороковин, И. А Особенности становления государственности Беларуси на советской основе и подготовка Конституции 1927 г. :монография // Сороковин, И. А. Минск: А.Н. Вараксин, 2020, - 178 с.
11. Тарасаў С.В.Еўфрасіння — Офрасіння — Афрасіння Полацкая. Яе час, яе крыж. Мн.: Цымбераў Р. М. – 2021. – 368 с.

## МЭТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННЮ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**Час, вызначаны на самастойную працу, можа быць выкарыстаны студэнтамі для:**

падрыхтоўкі да лекцый, семінараў;
падрыхтоўкі да кантрольных апытванняў, тэстаў;
прапрацоўку пытанняў,якія вынесены на самастойнае вывучэнне;
выкананне даследчыцкіх і творчых заданняў;
вывучэнне першакрыніц і дакументаў.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННЮ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**Асноўныя формы арганізацыі кіруемай самастойнай працай:**

напісанне рэферата і падрыхтоўка прэзентацыі;
выступленне з дакладам;
вывучэнне тэм, якія не выносіліся на лекцыі;
канспектаванне пісмовых крыніц;
складанне тэстаў для правядзення ўзаемакантролю;
складанне дыдактычных матэрыялаў.

**Кантроль кіруемай самастойнай працай ажыццяўляецца ў выглядзе:**

кантрольнай работы;
выніковых заняткаў з правядзеннем вуснага апытвання або тэсціравання;
абмеркавання рэфератаў;
абароны творчых праектаў;
ацэньвання вусных адказаў, паведамленняў, пісьмовых работ;
праверкі рэфератаў, канспекта крыніц і дакументаў;
індывідуальнай размовы.

## ПЕРАЛІК СРОДКАЎ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ДЛЯ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

**Вусная форма:**

размова па дадатковых пытаннях;
суразмова па пытаннях семінара;
даклады і паведамленні на семінарскіх занятках;
даклады і паведамленні на канферэнцыях;
апытванне па паняццях і тэрмінах.

**Пісьмовая форма**:

кантрольныя апытванні;
апытванне па датах і паняццях;
рэфераты;
публікацыі артыкулаў;
прэзентацый.

**Тэхнічная форма:**

электронныя тэсты.

## МЕТАДЫ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ НАВУЧАННІ

Лінейны(традыцыйны) метад: лекцыя, семінар.

Актыўны (інтэрактыўны) метад:

праблемна-арыентаванае навучанне PBL (Problem-BasedLearning);
камандна-арыентаванае навучанне TBL (Team-BasedLearning);
навукова-арынтаванае навучанне RBL (Research-Based Learning).

## ТЭМАТЫКА ЛЕКЦЫЙ

1. Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі.
2. Вялікае княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы.
3. Становішча беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай.
4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі.
5. Нацыянальна дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917 – 1941 гг.
6. Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея навейшай гісторыі.
7. Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР.
8. Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь.
9. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Заканадаўчая і судовая галіны ўлады.
10. Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады. Прэзідэнт Рэспублікі.
11. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні.
12. Этнагенез беларусаў і паходжанне назвы «Беларусь». Народы і рэлігіі.
13. Сацыяльна-эканамічная мадэль краіны. Беларусь у геапалітычнай прасторы.

## ТЭМАТЫКА СЕМІНАРАЎ

1. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі.
2. Вялікае княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы.
3. Беларусь у складзе Расійскай імперыі.
4. Нацыянальна дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917 – 1941 гг.
5. Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея навейшай гісторыі.
6. Медыцына ў гады вайны.
7. Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР.
8. Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь.
9. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Заканадаўчая і судовая галіны ўлады.
10. Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады. Прэзідэнт Рэспублікі.
11. Рэгіёны Беларусі.
12. Народы і рэлігіі Беларусі.
13. Сацыяльна-эканамічная мадэль краіны. Беларусь у геапалітычнай прасторы.
14. Дзяржаўныя сімвалы Беларусі.

## ПЕРАЛІК ПРАКТЫЧНЫХ НАВЫКАЎ

1. Аналіз працэсаў дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды.
2. Суаднясенне фактараў і механізмаў гістарычных змен з падзеямі мінулага.
3. Ацэнка падзей (асоб, артыфактаў, сімвалаў) для сучаснай беларускай дзяржаўнасці.
4. Аналіз літаратуры і крыніц па гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

## ТЭМАТЫКА КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ (РЭФЕРАТАЎ) ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ЗАВОЧНАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ.

1. Дзяржаўнасць як сацыяльна-палітычны і культурны феномен.
2. Ключавыя пытанні гісторыі беларускай дзяржаўнасці.
3. Крыніцы па гісторыі беларускай дзяржаўнасці.
4. Агульныя рысы і асаблівасці развіцця Полацкага і Тураўскага княстваў.
5. Агульнаруская ідэя і барацьба за аб'яднанне Русі.
6. Крэўская унія і вестэрнізацыя сацыяльна-палітычных інстытутаў.
7. Становішча беларускіх земляў у складзе Рэчы Паспалітай.
8. Пытанне дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі першай паловы XIX ст.
9. «Наша Ніва» і беларуская нацыянальная ідэя на пачатку XX ст.
10. Актывізацыя нацыянальнага руху ў гады Першай сусветнай вайны.
11. Першая сусветная вайна на беларускіх землях.
12. Рэвалюцыі 1917 г. і беларускае пытанне.
13. Белнацаім і яго роля ў стварэнні БССР.
14. Рэалізацыя нацыянальна-дзяржаўнай мадэлі развіцця ў 1920-я гг.
15. Стварэнне індустрыяльна-аграрнай рэспублікі і супярэчнасці развіцця сацыяльна-культурнай сферы ў 1930-я гг. у БССР.
16. Дасягненні і трагедыі савецкай эпохі.
17. Фарміраванне тэрытарыяльных межаў і адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання БССР у 1919–1945 гг.
18. Пасляваенная мадэрнізацыя ў БССР.
19. БССР – краіна-заснавальніца ААН.
20. Удзел беларусаў у ключавых бітвах Вялікай Айчыннай вайны.
21. Вызваленне Беларусі. Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя "Баграціён" – выдатнае дасягненне савецкай ваеннай тактыкі.
22. Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларусаў.
23 Подзвіг беларускіх урачоў у гадыВялікай Айчыннай вайны.
24. Беларуская савецкая дзяржаўнасць у 70-х- 80-х гг.
25. Савецкая сістэма аховы здароўя як элемент беларускай дзяржаўнасці.
26. Прыняцце Канстытуцыі і першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

27. Рэферэндумы 1995, 1996, 2004 гадоў і іх уплыў на стабілізацыю абстаноўкі ў краіне.

28. Фарміраванне прававых традыцый у Беларусі.

29. Канстытуцыя як асноўны закон дзяржавы.

30. Развіццё інстытута кіраўніка дзяржавы ў айчыннай гісторыі.

31. Асаблівасці манархіі як формы дзяржаўнага кіраванння ў сусветнай практыкі.

32. Спецыфіка партыйна-дзяржаўных узаемаадносін у савецкі час.

33. Прэзідэнцкая рэспубліка - выбар беларускага народа.

34. Функцыі і паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы як гаранта захавання Канстытуцыі, правоў і свабод грамадзян.

35. Трансфармацыя форм урадавай улады ў Беларусі.

36. Функцыі і задачы сучаснага ўрада.

37. Перадпарламенцкія формы прадстаўніцтва: веча і сеймы.

38. Нацыянальны сход як працяг традыцый двухпалатнага парламента ў суверэннай Беларусі.

39. Віды і паўнамоцтвы сучасных судоў у Рэспубліцы Беларусь.

40. Гістарычныя формы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу на беларускіх землях.

41. Функцыі і паўнамоцтвы мясцовага кіравання і самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь.

42. Гістарычная рэтраспектыва развіцця палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у Беларусі.

43. Характарыстыка геапалітычнага становішча Беларусі.

44. Беларусь у інтэграцыйных супольнасцях.

45. Значэнне Дзяржаўнага гімна, герба і флага для дзяржаўнасці.

46. Асноўныя гіпотэзы аб паходжанні беларусаў.

47. Этнічны склад сучаснай Беларусі.

48. Канфесійны склад насельніцтва Беларусі.

49. Асноўныя фактары сучаснага эканамічнага развіцця Беларусі.

50. Сістэма аховы здароўя Беларусі як візітная картка краіны.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назвавучэбнай дысцыпліны, зякой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацоўвала вучэбную праграму (дата і нумар праткола) |
|---|---|---|---|
| 1.Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны | Філасофіі і паліталогіі | няма | 25.05.2023 № 14 |

**СКЛАДАЛЬНІКІ :**

Дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэті», кандыдат гістарычных навук, дацэнт Н.А. Поляк

Загадчык кафедрыфіласофіі і паліталогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэті», кандыдат філасофскіх навук, дацэнт В.Л. Пазнякова

Змест, афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных дакументаў адпавядае ўстаноўленым патрабаванням.

Дэкан лячэбнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэті»
27.06 2023 А.І.Валатоўскі

Дэкан педыятрычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэті»
27.06. 2023 А.К.Філіповіч

Дэкан стаматалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэті»
27.06. 2023 Т.Л.Шэвела

Дэкан медыка-прафілактычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэті»
27.06. 2023 А.У. Гіндзюк

Дэкан фармацэўтычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэті»
27.06. 2023 Н.С.Гурына

Метадыст установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
27.06. 2023 С.А.Янковіч